14 ЧЭРВЕНЯ
1938 г.
№ 11—12 (63—64)

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

ОРГАН
парткома,
прафкома,
рэктарыята
Беларускага
дзяржаўнага
універсітэта

ПРАВА НА АСВЕТУ

Да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Беларусь была забітай, адсталай, цемнай краінай. Беларускі народ не меў ніводнай вышэйшай павучальнай установы. Не было нават сярэдніх і пачатковых школ на роднай беларускай мове.

У выніку перамогі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, калі рабочыя і сяляне Беларусі пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі Леніна—Сталіна разам з працоўнымі масамі ўсяго Совецкага Саюза ў лютай барацьбе перамаглі капіталістаў і памешчыкаў і пачалі будаваць шчаслівае соцыялістычнае жыццё, развіваць сваю нацыянальную па форме і соцыялістычную па зместу культуру, у выніку гэтай барацьбы і перамог і з'явіўся Беларускі дзяржаўны універсітэт. Ён з'яўляецца самай старэйшай вышэйшай навучальнай установай Совецкай Беларусі, але ён не адзін. Дзякуючы няспынным клопатам комуністычнай партыі большэвікоў аб беларускім народзе зараз у БССР налічваецца 22 вышэйшыя навучальныя ўстановы. 72 школы з спецыяльнай сярэдняй адукацыяй і 20 рабфакаў.

Для нашай моладзі шырока расчынены дзверы ў навуку, створаны ўсе магчымасці для авалодання вышынямі перадавой навукі. У Сталінскай Канстытуцыі залатымі літарамі запісана права ўсіх грамадзян нашай радзімы на асвету.

У сваёй гістарычнай прамове на прыёме ў Крэмле работнікаў вышэйшай школы таварыш Сталін гаварыў, што нашa навука навінны быць такой «Якая не аграджваецца ад народа, не трымае сябе ўдалі ад народа, а гатова служыць народу, якая гатова перадаць народу ўсе заваёвы навукі, якая абслугоўвае народ не па прымусу, а добраахвотна, з ахвотай».

Беларускі дзяржаўны універсітэт існуе 17 год. Ён вырас і ўмацаваўся ў жорсткай барацьбе з ворагамі партыі і народа—нацдэмамі, трацкістамі і іншымі, якія імкнуліся пралезці і часамі пралазілі ва універсітэт, каб рабіць сваю шкодную работу на развал совецкай навукі. БДУ мае выдатнае абсталяванне, прыгожыя будынкі, лабараторыі, кабінеты і музеі. Есць добрыя навуковыя кадры, вялікая частка якіх выхавана самім універсітэтам. За час свайго існавання БДУ падрыхтаваў каля трох тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў—матэматыкаў, фізікаў, хімікаў, гісторыкаў, геолагаў і біёлагаў.

Значная частка быўшых пітомцаў БДУ зараз працуе ў самім-жа універсітэце. Напрыклад, дацэнт Гельфанд У 1928 г. ён скончыў наш універсітэт, а зараз — кандыдат матэматычных навук. Тт. Шапіра, Некрашэвіч і рад іншых навуковых работнікаў універсітэта—усе яны нядаўна былі студэнтамі БДУ, а зараз самі чытаюць лекцыі студэнтам і вядуць навукова-даследчую работу.

Белдзяржуніверсітэту прадстаіць гаваровая задача—і надалей выхоўваць высокакваліфікаваныя кадры.

«Будучыня належыць моладзі ад навукі», — гаварыў таварыш Сталін. Такая моладзь выхоўваецца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, такой моладдзю нашы універсітэт павінен папоўніць свае аўдыторыі прадстаячым новым наборам.

Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае і радаснае жыццё

Мы, працоўныя БССР, з гонарам і вялікай радасцю аддадзім свае галасы за нашага любімага бацьку і друга таварыша І. В. Сталіна, за таварышоў В. М. Молатава, К. Е. Варашылава, Н. І. Ежова.

Я вельмі ганаруся работай нашага 4-га выбарчага ўчастка і часта там бываю. На рабоце гэтага ўчастка я бачу, што наша партыя і ўрад праяўляюць вялікія клопаты аб выбарчыках, каб выбаршчыкі добра ведалі Канстытуцыю і «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР».

На 4-м выбарчым участку ўсе гэтыя пытанні ўжо распрацаваны агітатарамі з выбаршчыкамі. Мы, хатнія гаспадыні, з вялікай цікавасцю і натхненнем слухалі прамову правадыра народаў на перадвыбарчым сходзе Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы, занесеную на патэфонныя пласцінкі.

Нам у краіне Советаў жывецца радасна і шчасліва таму, што аб нас клапоціцца таварыш Сталін.

Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае і радаснае жыццё.

Выбаршчыца ШНЕЙДЭРМАН.

З ВЯЛІКАЙ РАДАСЦЮ ЧАКАЕМ ДНЯ ВЫБАРАЎ

Набліжаецца гістарычны дзень 26 чэрвеня. У гэты дзень працоўныя нашай рэспублікі прыдуць да выбарчых урнаў, каб аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. У гэты дзень беларускі народ нашле ў свой вярхоўны орган дзяржаўнай улады леншых сыноў і дачок совецкага народа, палкіх патрыётаў нашай соцыялістычнай радзімы, партыйных і непартыйных большэвікоў, да канца адданых справе партыі Леніна—Сталіна.

Я прапую агітатарам на 4 выбарчым участку Кагановіцкай выбарчай акругі, я зраблю ўсё, каб мае выбаршчыкі ўсе, як адзін, у дзень выбараў 26 чэрвеня прышлі да выбарчых урнаў і аддалі свае галасы за кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Савінкага П. П.

Агітатар СУДАРАЎ.

Якуб Колас

Вялікаму абранніку беларускага народа

Як светлае ранне.
Абнятае сонцам,
Расходзіцца радасць
Па нашай старонцы.

І кожны ўсхваляван,
І кожны узнят:
Ён — родны наш Сталін
— Ён наш дэпутат!

Напоўнены сэрцы
Пачуццем высокім.
Нас гордасць шугае
Патокам глыбокім.

Шуміць наша радасць,
Як майскі парад:
Праслаўлены геній—
Ён — наш дэпутат.

І Молатау — розум
Совецкай Дзяржавы,
І Клім Варашылаў—
Шчыт воінскай славы,

І зоркія вочы
Вялікай зямлі.—
Ежоў наш любімы —
Нам згоду далі!

Падымем-жа вышай
Чырвоныя сцягі!
Дастойнымі будзьма
Вялікай увагі.

Каб любы наш Сталін,
Зірнуўшы на нас,
Сказаў-бы: «хвалю я,
Таварышы, вас».

Усенародны кандыдат

Выключна радасныя дні перажываюць працоўныя БССР і ўсёй нашай вялікай радзімы. 26 чэрвеня 1938 года беларускі народ будзе галасаваць за свайго першага кандыдата, любімага роднага Сталіна і за яго слаўных саратнікаў—Варашылава, Молатава, Кагановіча, Калініна, Ежова, Мікаяна, Андрэева, Жданава.

Асабліва вялікая радасць выбаршчыкаў Прамысловай акругі гор. Менска, якія будуць галасаваць за вялікага маршала комунізма, за таварыша Сталіна. Вялікі гонар, аказаны нам Сталіным і яго лепшымі саратнікамі, ускладае на нас, навуковых работнікаў Белдзяржуніверсітэта, адказную задачу—працаваць упарта над авалоданнем вярпынямі навукі, над умацаваннем сувязі навукі з соцыялістычным будаўніцтвам, за перадавую навуку.

Мы, навуковыя работнікі і студэнты Белдзяржуніверсітэта, ні на адну хвіліну не забываем аб тым, што толькі партыя Леніна—Сталіна, толькі наш Сталін вызвалілі народы Совецкага Саюза ад праклятых жахаў мінулага—нішчаты, бяспраўя, адсталасці. Вось чаму мы ўсе, як адзін чалавек, на выбарах у Вярхоўны Совет БССР будзем галасаваць за сталінскі блок комуністаў і беспартыйных, будзем галасаваць за Сталіна, які вывеў нас на светлы шлях і зрабіў наша жыццё радасным, як вясенні дзень.

Няма ніводнай краіны ў свеце, дзе адкрыты былі-б такія прасторы для перадавой навукі і для народнай творчасці, як у нас у сталінскай краіне Советаў.

«За счастливую светлую жизнь на земле,
Сталин, солнце мое, спасибо тебе».

Дацэнт ГЕЛЬФАНД.

НАШ КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР



Сялянскай Чырвонай Арміі вылучаецца кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Савіцкі Парфен Пятровіч, верны сын беларускага народа, выхаванец партыі Леніна—Сталіна.

Тав. Савіцкі зараз працуе другім сакратаром Менскага гаркома партыі.

Тав. Савіцкі аб сабе расказвае:

— Я нарадзіўся ў 1904 г. у мястэчку Гайшып, зараз Прапойскага раена БССР.

Бацька быў беззямельным. Працаваў на лесараспрацоўках і лесасплаве, на найму ў якасці чорнарабочага плытагона.

Я з 8 год пачаў наведваць Гайшыпскую земскую школу, дзе правучыўся 4 годы і ў 1916 г. скончыў яе.

У годы вучобы ў летні час працаваў па найму. У 1916 г. я паступіў у Прапойскае вышэйшае пачальнае 4-класпае вучылішча, якое скончыў у 1920 г.

Пасля сканчэння вучылішча пачаў працаваць на будоўлях у якасці будаўніка, а з 1922 г. займаўся земляробствам. У 1922 г. уступіў у рады ЛКСМБ. У 1925 г. комсамольскай арганізацыяй быў мабілізаван на работу ў сельсовет, дзе працаваў у якасці сакратара, а потым старшыні да 1927 г.

У ліпені 1927 г. я быў прынят у члены ВКП(б). У гэтым-жа годзе ГК КП(б)Б вылучае мяне старшынёй крэдытнага сельскагаспадарчага таварыства, дзе я працаваў да канца 1929 г. і быў перакінут РК КП(б)Б у райвыканком у якасці адказнага сакратара РВК. а ў 1931 г. быў паслан на работу ў якасці сакратара партячэйкі, па гэтай пасадзе прапрацаваў паўгода, а потым наехаў вучыцца ў Комвуз—г. Менск.

У 1934 г. скончыў Комвуз і быў пакінут на рабоце там-жа, у якасці рэдактара і выкладчыка.

У канцы 1935 г. рашэннем ГК і ЦК КП(б)Б быў уведзен у склад оргбюро Варашылаўскага райкома КП(б)Б, дзе прапрацаваў у якасці інструктара да ліставада месяца 1936 г.

У лістападзе 1936 г. рашэннем ГК і ЦК КП(б)Б быў пераведзен на работу ў Менскі гарком КП(б)Б у якасці загадчыка аддзелам школ гаркома КП(б)Б.

У кастрычніку 1937 г. Менскім ГК КП(б)Б вылучан выконваючым абавязкі сакратара Кагановіцкага РК КП(б)Б, райпартканферэнцыяй быў выбран першым сакратаром РК КП(б)Б. Пленумам Менскага ГК КП(б)Б абран сакратаром гаркома КП(б)Б.

За час прабывання ў комсамоле і ВКП(б) я спагнанням не падвяргаўся, ні ў якіх антыпартыйных групоўках не ўдзельнічаў, заўсёды вёў непрымірымую барацьбу з ворагамі народа.

Выбаршчыкі 4 участка Кагановіцкай выбарчай акругі, упэўнены, што Парфен Пятровіч Савіцкі поўпасю апраўдае давер'е беларускага народа, што ён будзе яшчэ з большым эптузіязмам змагацца за справу Леніна — Сталіна.

НА ЗДЫМКУ: слухачы палітгуртка хатніх гаспадынь 4 выбарчага участка Кагановіцкай выбарчай акругі, янім кіруе агітатар тав. Бабчонак, слухаюць прамову тав. Сталіна на прадвыбарчым сходзе Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы запісанную на грамафонныя пласцінкі.

Будзем галасаваць за непахіснага большэвіка тав. Савіцкага

У маёй кватэры па вуліцы Талстога, дом № 12, кватэра 5 праходзяць заняткі па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. У пашым гуртку займаецца 5 хатніх гаспадынь, якія акуратна наведваюць гэтыя заняткі. Гуртком пашым кіруе агітатар тав. Фішалевіч. Тав. Фішалевіч з вялікай любоўю вядзе з намі гутаркі аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР на цікавячыя нас тэмы. Гэтыя запяткі наведваюць і пашы мужчыны, якія працуюць на вытворчасці. Усе мы з вялікай увагай і інтарэсам слухаем гэтыя гутаркі, і ў дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР мы ўсе як адзін аддадзім свае галасы за кандыдата блока комуністаў і беспартыйных, за непахіснага большэвіка тав. Парфена Пятровіча Савіцкага.

Хатнія гаспадыні: ВЕТРАВА, КАРАНЕУСКАЯ і ЖУКАВА.

ДРУГУ-ЮБИЛЯРУ

Ты день сегодняшний зачислишь
В семью особо ярких дней —
Один раз празднуют ведь в жизни
Свой полнолетний юбилей.

В стране, где солнце ярко светит,
В стране с кремлевскою звездой,
Ты эту дату, друг мой встретил
Здоровый, бодрый, молодой.

Нам счастье в жизни всем знакомо:
И я имел такой же день,
Когда с фамилией наркома
Я опускал свой бюллетень.

В тот день—я ясно это помню —
Ты, мне завидуя, сказал:
«Не к стати очень что сегодня
Я возрастом немного мал».

Прошло полгода шагом бодрым
Среди кипящих жизни дел.
За эти дни в труде свободном
Ты много радости имел.

Сегодня вместе грянем песню
Про свет идущий из Кремля
Я—дней октябрьских ровесник
И ты—счастливый юбиляр.

Мы в песнях много дат возвысим —
Достойные такого—есть.
Придет в семью великих чисел
Число победы двадцать шесть.

На избирательный участок
Пойдем тогда, мой друг, с тобой
За жизнь, за Сталина, за счастье
Отдать свой голос молодой.

Мы будем жить, учиться, строить,
А если враг навяжет бой,
В числе бойцов, в числе героев
Мы будем, друг, тогда с тобой,

Чтоб сила нашего удара
С лица земли врагов смела,
Чтоб вечно радость расцветала.
Чтоб вечно молодость жила.

В. ШАХАВЕЦ.

Мы галасуем за партыю Леніна—Сталіна

Гурток, якім я кірую, наведваюць сістэматычна 8 хатніх гаспадынь (Маскоўская вуліца дамы № 9, 7 і 13). Займаемся адзін раз у шасцідзёнку. Ужо правялі 7 заняткаў. Прапрацавалі «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», даклад тав. Наталевіча, прамову тав. Сталіна на перадвыбарчым сходзе гор. Масквы і даклад тав. Сталіна на Надзвычайным VIII З'ездзе Советаў СССР.

Зараз хатнія гаспадыні знаёмяцца з біяграфіяй нашага кандыдата ў дэпутаты у Вярхоўны Совет БССР тав Савіцкага. У часе заняткаў кожны раз адводзім 10—15 мінут міжнародным падзеям.

Арганізавалі 4 экскурсіі ў гістарычны і біялагічны музеі БДУ, у дом 1 з'езда РСДРП і Палац піонераў.

Хатнія гаспадыні сістэматычна наведваюць заняткі і цікавяцца імі. Асабліва актыўна ўдзельнічаюць у рабоце гуртка тт. Гінзбург, Юшкевіч, Хомір, Дунер. Уся наша работа накіравана на тое, каб забяспечыць 100% яўку выбаршчыкаў 26 чэрвеня для галасавання за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Галасуючы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, мы галасуем за партыю большэвікоў, за партыю Леніна—Сталіна.

Агітатар ЦЯРЭШАНКА.

Аддадзім свае галасы за тав. Савіцкага

Мы, хатнія гаспадыні 4 выбарчага участка Кагановіцкай выбарчай акругі, пражываючыя па Маскоўскім перавулку, актыўна рыхтуемся да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Агітатары тт. Сударай і Бірылка з намі у зразумелых выразах праводзяць заняткі па вывучэнню Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР». Чулыя адносіны да нас, добрая якасць заняткаў нас вельмі зацікавілі.

Мы, хатнія гаспадыні, нарайні з усімі працоўнымі СССР у блоку комуністаў і беспартыйных будзем выбіраць лепшых людзей нашай краіны ў наш совецкі парламент. Мы ўсе як адзін аддадзім свае галасы за любімага таварыша Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў, а таксама будзем галасаваць за кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Савіцкага.

Душзўская, Акуліч, Гершовіч і яшчэ 16 подпісаў хатніх гаспадынь.

ШЧАСЦЕ СОВЕЦКАЙ ЖАНЧЫНЫ

«Няма больш забітай нядоляй
рабыні,
Заместа прыбітых балезных
жанок,
Стаханаўкі выраслі у нашай
краіне,
Іх ведае поле, рабочы станок».
(З Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну)

Здалёку нячуткай ступою надыходзіў піхі майскі вечар. Ружавеў небасхіл. У садзе пад зялёнай развесістай грушай, пакрытай белымі кветкамі вясны, сядзелі хатнія гаспадыні.

Абмываліся заняткі гуртка. Хатнія гаспадыні ўважліва слухалі прамову таварыша Сталіна на перадвыбарчым сходзе Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы, запісаную на патэфонныя пласцінкі. Кожнае слова дарагога правадыра глыбока залятала ў сэрцы жанчын. Яны радаваліся за свабоднае, светлае жыццё, гаварылі аб надыходзячым свяце беларускага народа—выбарах у Вярхоўны Совет БССР.

На гэтых занятках гуртка жанчыны ўспаміналі сваё мінулае—цяжкае жыццё. Хатняя гаспадыня Гулецкая кажа: «У маладосці я не бачыла жыцця. Малой дзяўчынкай я выконвала непасільную работу па паноў. За малацьбу ў памешчыка Агінскага я атрымлівала 10 кап. у дзень. Толькі цяпер я пазнала што такое радасць, што такое жыццё. Совецкая ўлада вярнула маю маладосць.

Хатняя гаспадыня Шырко мае ужо 63 годы. Свае дзявочыя годы яна правяла у няжкай працы на памешчыка Завімы Уздзенскага раёна. Непасільная праца губіла яе дзявочую красу. Яна тады не магла нават думаць, што яе дзеці будуць жыць у такім шчасці, якое атрымалі пры Совецкай уладзе. Вось яе сын—Міхаіл—упаўнаважаны па загатоўках у Ленінградскай вобласці. Васіль—старшы аграпом. Уладзімір—галоўны інжынер па Волхаўбудзе.—А сын Антон,—кажа Шырко,—якога я нарадзіла у полі за панскай работай, зараз працуе старшым буравым майстрам.

— Я радуюся за сваю сям'ю, за сваё жыццё, за якое ад шчырага сэрца прыношу вялікае дзякуй роднаму Сталіну.

Нашы зараз шчаслівыя жанчыны добра памятаюць здзекі белапольскіх уланаў, енкі і голад. Мінулі часы нядолі і беспраўя для совецкай жанчыны, яны не вернуцца ніколі.

Свабодныя жанчыны Совецкай Беларусі пра радасць і шчасце спяваюць новыя песні. З песняй, з вясёлым бадзёрым настроем яны пойдуць 26 чэрвеня да выбарчых урнаў і апусцяць свае бюлетэні за лепшых сыноў партыі і совецкага народа.

На долю агітатараў выпала вялікае шчасце праводзіць падрыхтоўку да вялікага свята беларускага народа — выбараў у совецкі парламент. Праводзячы работу сярод хатніх гаспадынь, я дабіюся 100% галасавання выбаршчыкаў свайго ўчастка і гэта будзе вынікам маёй работы.

ІВ. КАЛІНІН.

ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

Гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта быў арганізаван у 1934 г. пасля вядомай пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб выкладанні грамадзянскай гісторыі. Курс навучання на факультэце — пяцігадовы. Гістфак рыхтуе кваліфікаваных выкладчыкаў гісторыі для сярэдняй школы і малодшых навуковых работнікаў для навукова-даследчых устаноў.

Прэзрэнныя ворагі народа, стаяўшыя ў кіраўніцтве універсітэта і гістфака імкнуліся разваліць работу аднолькі. Але гнусная і здрадніцкая дзейнасць ворагаў народа была выкрыта, ворагі выяўлены і знішчаны. Універсітэт цалкам і гістфак, у прыватнасці, у сучасны момант ліквідуюць вынікі шкодніцтва. З наступнага вучэбнага года ўводзяцца новыя стабільныя вучэбныя планы. Яны пабудованы з такім разлікам, каб ліквідаваць многапрадметнасць. У гэтым вучэбным годзе гістфак запрасіў на работу рад новых навуковых работнікаў. Зараз на гістарычным факультэце працуе 18 чалавек навуковых работнікаў. З іх 1 акадэмік (П. М. Нікольскі), 2 прафесары, 10 дацэнтаў, 1 асістэнт і 4 выкладчыкі замежных моў. Вучоную ступень доктара навук маюць двое (Н. М. Нікольскі і В. Н. Перцаў), вучоную ступень кандыдата навук — чацвера. Тры дысертацыі на вучоную ступень кандыдата навук падрыхтаваны да абароны.

Вучэбная і навукова-даследчая работа гістарычнага факультэта сканцэнтравана на кафедрах, у сучасны момант на факультэце ёсць чатыры наступных кафедры:

1) Кафедра гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў (загадчык кафедры акадэмік Нікольскі), 2) кафедра гісторыі новага часу (заг. кафедры дацэнт Шнеерсон), 3) кафедра гісторыі СССР (заг. кафедры дацэнт П'янкоў), 4) кафедра соцыяльна-эканамічных дысцыплін (заг. кафедры дацэнт Чымбург). Пры трох кафедрах ёсць аспіранты. Яны рыхтуюцца да выкладчыцкай і навукова-даследчай работы ў ВНУ. Двое з аспірантаў працуюць ужо над дысертацыямі.

Таварышы, якія заканчваюць у гэтым годзе сярэднія навучальныя ўстановы і жадаючыя ўсебакова ведаць агульную гісторыю і гісторыю нашай радзімы, павінны пайсці вучыцца на гістфак.

На першым курсе гістфака ў наступным вучэбным годзе будуць прачытаны наступныя прадметы: гісторыя дакласавага грамадства і старажытнага ўсхода, гісторыя старажытнай Грэцыі і Рыма, гісторыя СССР (да XIX стагоддзя), гісторыя Беларусі (да XIX стагоддзя), налітэканомія і іншыя. Па двух гэтых курсах — па гісторыі Грэцыі і Рыма і па гісторыі СССР—будуць праводзіцца практычныя заняткі са студэнтамі. Яны будуць знаёміць студэнтаў з асноўнымі гістарычнымі першакрыніцамі. Пры гістарычным факультэце ёсць гістарычны кабінет. У бягучым вучэбным годзе ён значна папоўніцца гістарычнымі картамі і іншымі наглядными дапаможнікамі. Гэта дае магчымасць з наступнага вучэбнага года выкладанне цэлага раду прадметаў суправаджаць дэманстраваннем гістарычных карт, дыяпазітываў, альбомаў і г. д.

П'ЯНКОЎ.

ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

Хімічны факультэт Белдзяржуніверсітэта быў вылучан у самастойную адзінку ў 1933 г. з прыродазнаўчага аддзялення універсітэта. Хімфак рыхтуе высокакваліфікаваных выкладчыкаў для ноўных сярэдніх школ, тэхнікумаў і малодшых навуковых работнікаў для навукова-даследчых устаноў. Тэрмін навучання на хімфаку 5 год. У сучасны момант на факультэце навучаецца 220 чалавек студэнтаў на пяці курсах. У гэтым годзе факультэт выпускае 40 кваліфікаваных спецыялістаў па арганічнай, неарганічнай і фізічнай хіміі.

Многія з скончыўшых хімфак і аспірантуру пры ім маюць друкаваныя работы па хіміі і некаторыя атрымалі ўжо вучоную ступень кандыдата хімічных навук. Падрыхтаваны да абароны дзве дысертацыі на кандыдата хімічных навук.

На першым курсе ў наступным навучальным годзе на факультэце будуць чытацца наступныя дысцыпліны: неарганічная хімія з вялікім практыкумам, фізіка з практыкумам, вышэйшая матэматыка, палітэканомія і іншыя.

Факультэт мае добра абсталяваныя аўдыторыі для лекцый і лабараторыі для практычных заняткаў па хіміі.

Дэкан хімфака БДУ
МАРКОЎКА.

Виктор ГУСЕВ

МОЯ РОДИНА

Я, боец миллионной рати,
Твой сын и защитник, родина-мать,
Я, советской страны избиратель,
За что я буду голосовать?
Я вижу мир.

Надвигаются грозы.
Чувствует бурю сердце мое:
Нагрузив полностью бомбовозы,
Взлетает фашистское воронье.
И китаянка теряет сына.
В пламени, в грохоте и в дыму
Японская бомба у стен Бейпина
На части голову рвет ему.
Я вижу снарядом разбитую кровлю.
Сжимается в горе рука моя.
Далекую и покрытую кровью
Землю Испании вижу я.
Сжигает своим ядовитым ветром
Слова о чести и праве—война.
Я вижу с гордостью, сын Советов,—
Мир охраняет наша страна.
Кличет пламя советского флага
К себе всех честных и всех живых.
Крепнут спокойствие и отвага
Пограничных моих часовых.
Готовы к бою военные части
Коршунам нашей страны не терзать.
Я пойду к избирательному участку
За мир и за армию голосовать.
Когда утром я открываю
Высокие окна квартиры моей.
Все больше школьников я замечаю,
Все больше насчитываю детей.
Проходят матери—взгляд их светел.
Шагают отцы, сыновьями горды,
Счастье страны отражается в детях,
Как луч отражается в капле воды.
Живите, ребята, отцам на славу.
До вас не дотянется вражья рать.
В нашем небе имеют право
Только наши пилоты летать.
Какие дети у нас подрастают!
Любуется ими советский народ.
Страна, как нежная мать, встречает
Три миллиона младенцев в год.
И хлеб, и школу, и труд, и счастье
Она сумеет каждому дать.
Я пойду к избирательному участку
За наше грядущее голосовать.
Далека моей жизни осень,
Дороги прекрасные мне видны.
Мне всего только двадцать восемь,
Я лишь немного старше страны.
Нас, мальчишек, она растила,
Хлебом кормила в голодный час,
Дала нам знанья, дала нам силу,
Словом—в люди вывела нас.
И когда мы над морями летаем,
Строим, изобретаем, творим, —
Кого мы с гордостью вспоминаем,
Кого с любовью благодарим?
Кто вслед за Лениным вел нас к счастью?
С кем мы будем в боях побеждать?
Я пойду к избирательному участку
За нашего Сталина голосовать!

КАГО РЫХТУЕ ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БДУ

Веліка і рознастайна наша соцыялістычная радзіма. Яна працягнулася на дзесяткі тысяч кілометраў з захада на ўсход, ад гарачых пустынь Сярэдняй Азіі, ад горных вяршынь Паміра і Алтая да Паўночнага полюса. Наяўнасць рознастайных багаццяў на паверхні і ў нетрах нашай зямлі стварае вялікую базу для шырокай і плённай дзейнасці геаграфаў і геолагаў нашай краіны.

Дасягненні СССР у галіне заваявання Паўночнага полюса, асваенне Паўночна-Марскога шляху, пабудова каналаў і шляхоў зносін, асушэнне балот і абваднненне пустынь, павышэнне ўраджайнасці ў соцыялістычным земляробстве, даследаванне месцазнаходжання карысных выкапняў, вывучэнне мясцовасцей будовы новых прадпрыемстваў і гарадоў, вывучэнне стратасферы і марскіх глыбінь, складанне усякіх карт і атласаў ажыццяўляецца пры ўдзеле нашых географаў.

У нашай краіне вучоныя даследчыкі і выкладчыкі карыстаюцна шырокай папулярнасцю. Па ініцыятыве таварыша Сталіна былі створаны геаграфічныя факультэты пры радзе вышэйшых навучальных устаноў, у тым ліку і пры БДУ, для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных географаў—даследчыкаў і настаўнікаў.

Геафак пры Белдзяржуніверсітэце рыхтуе навуковых работнікаў даследчыкаў, настаўнікаў для вышэйшых і сярэдніх школ у галіне фізічнай і эканамічнай геаграфіі СССР і капіталістычных краін.

В. а. дэкана геафака БДУ
ЖЫЛІНСКІ.

АБ НОВЫМ НАБОРЫ СТУДЭНТАЎ У БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ

Права на асвету, зацверджанае Сталінскай Канстытуцыяй, забяспечвае для совецкай моладзі бесперашкодны доступ ва ўсе навучальныя ўстановы Саюза.

Совецкая ўлада адпускае вялікія сродкі на справу народнай асветы, на будаўніцтва школ, універсітэтаў вучэбных і навукова-даследчых лабараторый, інтэрнатаў і іншых навучальна-дапаможных устаноў.

Вялікая колькасць сярэдніх школ, створаных за годы сталінскіх пяцігодак, з кожным годам павялічвае лік моладзі, агрымаўшай сярэднюю асвету, з кожным годам совецкія ВНУ прымаюць усё новыя і новыя папаўненні. І як правіла, усякі набор студэнтаў па колькасці больш папярэдняга.

Магчымасць атрымаць вышэйшую асвету ў краіне соцыялізма гэта не мара, а рэальны факт для ўсіх працоўных СССР. У БССР адной з самых вялікіх навучальных устаноў з'яўляецца Беларускі дзяржаўны універсітэт, куды будзе прынята ў гэтым годзе 300 студэнтаў. Паступаючыя на геаграфічны факультэт павінны трымаць дадатковыя іспыты па геаграфіі, а паступаючыя на гістарычны факультэт павінны трымаць дадатковыя іспыты па гісторыі і геаграфіі.

У сувязі з новым прыёмам трэба асоба звярнуць увагу на значны недахоп у ведах некаторай часткі паступаючых ва універсітэт. Вельмі часта студэнты, праявіўшы дастатковыя веды ў палітграмаце, матэматыцы, фізіцы, хіміі і іншых прадметах, выяўляюць недаравальную непісьменнасць па рускай і беларускай мовах.

Ворагі народа спецыяльна культывавалі зняважлівыя адносіны да рускай мовы. Ворагі народа вялі падрыўную работу супроць брацкага саюза народаў СССР і імкнуліся закабаліць Беларусь польскім і нямецкім фашызмам.

Гэта варожая лінія зрабіла ўплыў і на арганізацыю ўсёй народнай асветы. Мінулае варожае кіраўніцтва Наркамасветы звяло амаль на нішто выкладанне рускай мовы ў пачатковых і сярэдніх школах БССР. Зачастую руская мова ў школе займала менш гадзін, чым нямецкая. Амаль аналагічнае становішча стварылася і ў адносінах вывучэння беларускай мовы. Многія выкладчыкі сярэдніх школ згаджаліся з гэтай ненармальнай з'явай і несвядома ішлі на паваду ў арудаваўшых раней ворагаў народа. У выніку гэтага мы апынуліся перад такім фактам, што сярэдняя школа выпускае не зусім поўнацэнных людзей, людзей малакультурных у галіне рускай мовы. Далей з такім становішчам мірыцца нельга. Пры новым наборы студэнтаў будзе звернута выключная ўвага на рускую і беларускую мовы. Веданне роднай мовы і літаратуры павінна быць удасканаленае.

Прыём заяў аб залічэнні ў БДУ будзе праводзіцца з 20 чэрвеня па 1 жніўня г. г.

Да заявы неабходна прыкласці наступныя дакументы:

а) падрабязную аўтабіяграфію,

б) атэстат аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы,

в) пашпарт (прад'яўляецца асабіста),

г) тры фотакарткі з уласпаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, засведчаным дзяржустановай,

д) даведка аб адносінах да вайсковага абавязку.

Ужо цяпер да нас паступаюць пісьмы аб заканчваючых сярэднія школы. Яны цікавяцца правіламі прыёму, структурай БДУ і ўмовамі вучобы. Па гэтых пісьмах можна бачыць, што задачы Белдзяржуніверсітэта недастаткова папулярызаваны сярод моладзі. У сувязі з новым прыёмам у БДУ гэтымі днямі Белдзяржуніверсітэт пасылае сваіх прадстаўнікоў у найбольш буйныя раёны БССР: праф. Годнеў Т. Н. едзе ў Віцебск, праф. Нікіфараў В. К. і дацэнт Сагаловіч едуць у Гомель, дацэнт Зудзілін — у Бабруйск, дацэнт Некрашэвіч І. Г. — у Оршу, дацэнт Дудзінскі—у Слуцкі і Грэскі раёны, аспірант Шабуня—у Магілеў.

Для сярэдніх школ гор. Менска Белдзяржуніверсітэт намячае правядзенне розных экскурсій у лабараторыі БДУ. 26 мая г. г. фізмат БДУ арганізаваў для выпускнікоў 2-й сталінскай школы паказ фізічных доследаў, як-го: праходжанне электрычнасці праз газы, рэнтгенаўскія праменні, уласцівасці вадкага паветра, ультракароткія электрычныя хвалі і інш.

Доследы праводзілі дацэнты Шапіра І. П. і Пекрашэвіч І. Г. Прысутнічала 15 выпускнікоў сярэдняй школы. Па водзывах прысутнічаўшых доследы прайшлі дастаткова ўдала і з'явілися яркай дэманстрацыяй дасягненняў совецкай фізікі.

У бліжэйшы час неабходна часцей арганізоваць падобныя доследы і экскурсіі ў музей і лабараторыі універсітэта для больш шырокай аўдыторыі выпускнікоў.

Пята моладзі да вучобы—вялікая.

Совецкая моладзь імкнецца агрымаць фундаментальныя веды ў той ці іншай галіне навукі, совецкія ВНУ даюць з года ў год для соцыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі новыя высокакваліфікаваныя кадры, кадры, да канца адданыя справе Леніна—Сталіна, справе нашай радзімы.

Па-большэвіцку сустрэнем новы набор у ВНУ. Адбярэм лепшую моладзь для вучобы ў БДУ.

Прарэктар па вучэбнай частцы БДУ
П. ДЗЕМІН.

ПАРЕНЬ ХАЧО

— Парень Хачо,
Голый Хачо!
Вместо кабы[1]) из дыр и заплат
Новеньким френчем стал ты богат.
Кто тебе дал?
Кто тебе дал?
— Френч, облекающий крепкий мой стан,
Лениным, Лениным френч этот дан,
Лениным!
— Парень Хачо.
Нищий Хачо!
Вместо драных чулок, не солги,
Длинные, выше колен сапоги
Кто тебе дал?
Кто тебе дал?
— Мне сапоги этой самой длины
Лениным, Лениным тоже даны.
Лениным!
— Парень Хачо.
Товарищ Хачо!
Был молчаливей ты всех горемык!
Новый твой, острый, искусный язык
Кто тебе дал?
Кто тебе дал?
— Мне в батраках кто к молчанью привык,
Лениным дан мой искусный язык,
Лениным!
Товарищ Хачо,
Профессор Хачо!
Темным ты был батраком —уй-ю-ю! —
Знанья твои, всю ученость твою
Кто тебе дал?
Кто тебе дал?
— Мне, как и многим, что были темны,
Лениным знания наши даны.
Лениным!
— Славный Хачо,
Знатный Хачо!
Ты—лучший колос родных наших нив!
«Ленина орден», твой труд оценив,
Кто тебе дал?
Кто тебе дал?
— Мне за все то, что в труде моем есть,
«Ленина орден», как высшая честь,
Сталиным дан,
Сталиным дан,
Сталиным!

Записано в с. Гарни и других селениях Котайского района. Перевод с армянского.

[1]) Каба—верхняя одежда.

Працоўныя СССР! Выбірайце ў Вярхоўныя Советы Саюзных і Аўтаномных Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік доблесных патрыётаў нашай радзімы, непахісных барацьбітоў за шчасце рабочых і сялян, за соцыялізм.

НА ЗДЫМКУ: памяшканне 4 выбарчага участка Кагановіцкай выбарчай акругі.

РАДЗІМЕ І ПРАВАДЫРУ

Беларуская краіна,—
Твой шырокі шлях!
Над табой у зорнай сіні
Палымнее сцяг.
Гэта ты упартай волай
На прастор і шыр
Вывеў нас з былой няволі,
Мудры правадыр.
І цвіце мой край чароўных
Пушчаў і азёр
У сям'і свабодных, роўных
Маладых сясцёр.
Гэта ты рукою дужай
Даў народам мір,
Нас навек з'яднаўшы дружбай,
Мудры правадыр.
І ніякія напасці
У самы трудны час
Не парушаць долі-шчасця,
Не падзеляць нас.
Мы ідзем адной калонай,
Бурнаю, што вір,
Над зарой твайго Закона,
Мудры правадыр.
І сабраўшыся на першы
Незвычайны сход,
У Совет сыноў найлепшых
Выбера народ.
Ты да новай перамогі
На прастор і шыр
Нам паказваеш дарогі,
Мудры правадыр.

Янка Купала, Якуб Колас, Андрэй Александровіч, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Кандрат Крапіва, Аркадзь Куляшоў.

Май, 1938 г.

ДАВЕДКА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ

4-ты выбарчы ўчастак Кагановіцкай выбарчай акругі знаходзіцца па Маскоўскай вул. № 19.

У 4-ты выбарчы ўчастак уваходзяць наступныя вуліцы і нумары дамоў:

1. Маскоўская—нячотны бок—з № 1 і да № 27 уключна.
2. Вуліца Талстога—чотны бок—з № 2 да № 22 уключна.

Нячотны бок—з № 1 да № 23.

3. Пер. Талстога—чотны бок—з № 2 да № 16.

Нячотны бок—з № 1 да № 11.

4. Рабкораўская вул.—чотны бок—з № 2 да № 30 уключна.
5. Рабкораўскі пер.—нячотны бок—з № 1 да № 7
6. Праездны пер.—чотны бок—з № 6 да № 16.

Нячотны бок—з № 7 да № 17.

Склад камісіі 4-га выбарчага участка:

1. Лапуноў Н. П. — старшыня.
2. Пракаповіч Е. С. — намеснік старшыні.
3. Давыдзька Б. І. — сакратар

Члены выбарчай камісіі:

1. Багалюбаў М. Я.,
2. Шаумон В. П.,
3. Яскевіч М. А.,
4. Шарыхіна Д. І.

ФАРМАЛІЗМ

Партыйны камітэт БДУ вынес правільнае рашэнне аб праверцы работы агітатараў на выбарчым участку. Але партдаверапы ўчастка тав. Арашкевіч няправільна, зусім фармальна падыходзіць да выканання гэтага рашэння.

У першых числах чэрвеня павінна была праводзіцца парада агітатараў, на якой і павінна было разглядацца пытанне аб іх рабоце. Пры падрыхтоўцы да нарады тав. Арашкевіч катэгарычна прапанаваў праводзіць заняткі агітатарам да 1 чэрвеня ў прысутнасці прадстаўніка па праверцы заняткаў. Гэта нас. агітатараў, выбівае з калеі планавай работы.

Мы праводзім заняткі для прадстаўнікоў, рыхтуючых матэрыялы да нарады агітатараў, ці для выбаршчыкаў?

Трэба сістэматычна, планава кіраваць выбарчым участкам і правяраць работу агітатараў. **БЕЙЛІНСОН.**

ПЁТР 1

У канцы XVII стагоддзя маскоўскім царом стаў Пётр 1. К гэтаму часу ў Маскоўскай дзяржаве наспеў цэлы рад неадкладных рэформ. Барацьба народных мас супроць памешчыкаў прымушала апошніх умацоўваць дзяржаўны апарат. Апроч таго, трэба было рэарганізаваць армію, стварыць флот, развіць прамысловасць і гандаль. У гэтым былі зацікаўлены і памешчыкі і купцы.

Цар Пётр 1 праводзіў наспеўшыя рэформы. Ён не лічыўся з баярскай думай і прыцягваў да сябе іншакраінцаў, выкарыстоўваючы іх ў якасці ваенных спецыялістаў, майстраў, настаўнікаў і т. д.

Каб завалодаць выхадам к Чорнаму мору, Пётр і ваяваў з Турцыяй. Ён узяў у туркаў крэпасць Азоў (1696 г.). Азоў быў узят пры дапамозе флота. Апошні быў пабудован на Дану. Для вывучэння марской справы Пётр 1 адправіўся ў Заходнюю Еўропу. Ён пабываў у Галандыі, Англіі і ў іншых краінах. У Галандыі цар працаваў з тапаром у руках на пабудове караблёў. Завядзенню флота Пётр 1 надаваў вялікае значэнне. Флот быў патрэбен для завалодання берагамі Балтыйскага мора. Уладанні Швецыі адрэзалі Маскоўскую дзяржаву ад берагоў Балтыкі. Гэта перашкаджала развіццю гандлю з Заходняй Еўропай і тармазіла агульнае развіццё краіны.

У часе прабывання Пятра 1 за граніцай паднялі паўстанне стральцы (1698 г.). Яны былі супроць нячатых рэформ і патрабавалі звароту да старыны. Гэта быў рэакцыйны рух. Цар звярнуўся з-за граніцы і расправіўся з паўстаўшымі. Старое стралецкае войска было зніштожана.

Жадаючы завалодаць берагамі Балтыйскага мора, Пётр 1 у 1700 г. пачаў ваяваць са Швецыяй. Першы вялікі бой (над Нарвай) скончыўся для Пятра паражэннем, але, дзякуючы энергічным мерам цару ўдалося падняць боездольнасць сваёй арміі. Праз некалькі год рускае войска разбіла над Палтавай армію шведскага караля Карла XII (1709 г.). У часе вайны са Швецыяй Пётр завалодаў берагамі Фінскага заліва і Балтыйскага мора. У 1703 г. ля вытокі Нявы ён пабудаваў крэпасць і горад Пецярбург. Праз некаторы час гэты горад Пётр 1 зрабіў сталіцай. На Балтыйскім моры Пётр завёў флот. У 1714 г. гэты флот перамог шведскі флот ля берагоў Фінляндыі. Вайна са шведамі скончылася у 1721 г. У выніку гэтай вайны Расія набыла берагі Балтыйскага мора. За завалаванне імі Масква змагалася яшчэ з сярэдзіны XV стагоддзя. У 1722-1723 гг. Пётр ваяваў з Іранам. У гэтай барацьбе яму дапамагалі народы Закаўказзя (армяне, грузіны, азербайджанцы). Яны змагаліся тады супроць цяжкага ўладарства іранскага шаха. Вайна з Іранам умацавала пазіцыі Расіі на шляху у краіны Усхода.

Актыўная знешняя палітыка Пятра 1 абыходзілася вельмі дорага народным масам. Узрасталі падаткі, узмацнялася прыгнечанне сялян памешчыкамі-прыгоннікамі. Сялян забіралі ў армію, а служба ў ёй была тады цяжкай і доўгай. Сяляне павінны былі будаваць крэпасці, каналы, заводы і т. д. У часе вайны са шведамі сяляне паўсталі супроць памешчыкаў. Народны рух ахапіў многія вобласці дзяржавы. Сяляне падымаліся на памешчыкаў у цэнтры, на Волзе і ў іншых месцах. Паўсталі народы царскіх калоній — башкіры, татары, чувашы і мардва. Ім дапамагалі украінскія (запарожскія) казакі. На чале паўстаўшых данскіх казакаў і сялян стаяў Кандрат Булавін (1707-1708 гг.). Увесь гэты антыфеадальны народны рух быў падаўлен царом і памешчыкамі. У падаўленні іх Пятру 1 дапамагалі «дамавітыя» казакі Дона і феадальная вярхушка башкір і татар. У агульнай складанасці адкрытая барацьба народных мас супроць прыгонніцкага ўціску цягнулася цэлых 7 год (1704—1711 гг.) Гэта была новая сялянская вайна. Яна, як і сялянскія войны да Пятра 1, закончылася паражэннем народных мас. Прычыны паражэння былі тыя-ж самыя, што і ў часы Івана Балотнікава і Сцяпана Разіна.

Цар Пётр 1 вёў настойлівую барацьбу з адсталасцю сваёй краіны. Па словах В. І. Леніна Пётр «паскараў перайманне заходніцтва варварскай Русью» (Гв. т. XXII, стар. 517). Ён хацеў «выцягнуць краіну з адсталасці» (праф. Шэстакоў). Замест старой баярскай думы Пётр стварыў Сенат (1711 г.). Цар зніштожыў шматлікія «прыказы» і замяніў іх калегіямі (1718 г.). Усю дзяржаву ён падзяліў перш на 8, а потым на 11 губерняў. Кожная губерня яднала значную колькасць паветаў. Губернатары загадвалі наборам салдат і зборам падаткаў. Намесці былі адданы ў поўнае ўладанне дварап. У 1721 г. Пётр 1 прыняў тытул імператара. Гэты тытул павінен быў падкрэсліваць магутнасць Расіі.

Цар прымаў меры для развіцця прамысловасці. Пры Пятры 1 узнік цэлы рад новых заводаў. У тым ліку былі набудаваны металургічныя заводы на Урале. На заводах у часы Пятра 1 працавалі не наёмныя, а прыгонныя рабочыя. Яны мала адрозніваліся ад сялян. Новыя заводы будавалі купцы і памешчыкі. Былі і казённыя заводы. Уладальнікі заводаў атрымлівалі ад цара вялікія ільготы.

Пры Пятры 1 значна развіўся гандаль як унутраны, так і замежны. Пётр 1 звярнуў вялікую ўвагу на адукацыю. Ён прымушаў дваран вучыцца ваеннай справе, замежным мовам, адпраўляў для атрымання асветы ў Заходнюю Еўропу.

Пры Пятры 1 Расія значна шагнула ўперад, але ў ёй папавала прыгоннае права і царскае самадзяржаўе. Памешчыкі-дваране сумесна з купецтвам прыгнятралі не толькі рускіх сялян, але і шматлікія народы царскіх калоній.

«Пётр I зрабіў многа для ўзвышэння класа памешчыкаў і развіцця нараджаўшагася купецкага класа. Пётр зрабіў вельмі многа для стварэння і ўмацавання нацыянальнай дзяржавы памешчыкаў і гандляроў. Трэба сказаць таксама, што ўзвышэнне класа памешчыкаў, садзейнічанне нараджаўшамуся класу гандляроў і ўмацаванне нацыянальнай дзяржавы адбывалася за лік прыгоннага сялянства, з якога здзіралі тры шкуры» (І. Сталін—«Гутарка з нямецкім пісьменнікам Эмілем Людвігам»). **ДАЦ. П. П'ЯНКОУ.**

Менск, друкарня «Звязды» Облліт № 3811. Адказны рэдактар І. ЛЕВІН.